Вообще, стихотворение «Мне осталась одна забава…», безусловно, можно назвать есенинской исповедью, которая отражает основные принципы поэта, его заблуждения и раскаяния в этом. В тоже время это и творческий манифест – объяснение своей поэзии, её цели. Последняя строфа читается как завещание – искреннее последнее желание. И это не может не тронуть читателя. Вдумаемся в глубину следующих слов:

Чтоб за все за грехи мои тяжкие,
За неверие в благодать
Положили меня в русской рубашке
Под иконами умирать [3, с.132].

Ещё одно стихотворение привлекает к себе внимание. Называется оно «Песня», этим подчёркивается особая музыкальность стихотворения. В нём чувствуется боль и горечь за утраченные годы:

Есть одна хорошая песня у соловушки –
Песня панихидная по моей головушке.

Цвела – забубенная, росла – ножевая,
А теперь вдруг свесилась, словно неживая…

Я отцвёл, не знаю где. В пьянстве, что ли? В славе ли?
В молодости нравился, а теперь оставили [8, с.53 – 54].

С.П. Кошечкин приводит слова одного из героев Василия Шукшина: «Вот, жалеют: Есенин мало прожил. Ровно – с песню. Будь она, эта песня, длинней, она не была бы такой щемящей. Длинных песен не бывает» [4, с.351]. К этим словам трудно что-либо добавить.

ЛИТЕРАТУРА


1 Есенин, С.А. Сочинения / С.А. Есенин. – М.: Художественная литература, 1991. – 704 с.

2 Есенин, С.А. Собрание сочинений: в 5 т. / С.А. Есенин. – М.: Государственное издательство художественной литературы, 1961 – 1962. – Т. 5: Автобиографии, статьи, письма. – 1962. – 455 с.

3 Есенин, С.А. Собрание сочинений: в 5 т. / С.А. Есенин. – М.: Государственное издательство художественной литературы, 1961 – 1962. – Т. 2: Стихотворения (октябрь 1917 – 1924). – 1961. – 314 с.

4 Кошечкин, С.П. Есенин и его поэзия / С.П. Кошечкин. – Баку: Язычы, 1980. – 353с.

5 Прокушев, Ю.Л. Сергей Есенин. Образ, стихи, эпоха / Ю.Л. Прокушев. – М.: Московский рабочий, 1975. – 328 с.

6 Есенин С.А. в воспоминаниях современников: в 2 т. / сост. А. Козловский. – Москва: Художественная литература, 1986. – Т. 1. – 511 с.

7 Волков, А.А. Художественные искания Есенина / А.А. Волков. – М.: Советский писатель, 1976. – 440 с.

8 Есенин, С.А. Собрание сочинений: в 5 т. / С.А. Есенин. – М.: Государственное издательство художественной литературы, 1961 – 1962. – Т. 3: Стихотворения и поэмы (1924 – 1925). – 1962. – 279 с.


***Н.Л. Кузьміч (Беларусь)***

## ПОКУЛЬ ЛЯЦІМ… (ТЭМАТЫЧНЫЯ АБСЯГІ ПАЭЗІІ Э. АКУЛІНА)

Тэматычная прастора паэзіі Э. Акуліна знаходзщца ў традыцыйным для беларускай літаратуры вымярэнні зместу і характарызуецца звыклымі для чытача тэмамі і праблемамі. Але кожная творчая індывідуальнасць мае свой погляд на рэчы, сваё бачанне рэчаіснасці, таму здольная самыя будзённыя пытанні асэнсоўваць у незвычайным святле. Магістральнай у творчасці Э. Акуліна з'уляецца тэма духоўнага адраджэння беларускага народа, яго старажытнай і самабытнай мовы, адметнай культурнай спадчыны. Па дапамогу паэт звяртаецца да апосталаў беларускага Адраджэння — Францшка Багушэвіча, Максіма Багдановіча, Янкі Купалы, спадзеючыся, што іх святыя душы заўсёды будуць своеасаблівым абярэгам:

Стаю на цвінтарным ганку,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

дзе неба ніжэй званіц— Францішак, Максім, Янка,
прад Вамі схілёны ніц *(«Стаю на цвінтарным ганку...»)* [2]

Чарнобыль чорным груганом уварваўся ў жыццё паэта, засланіўшы сваім пякельным крылом роднае веткаўскае сонца. Малая радзіма Акуліна стала зонай адчужэння, зонай трывожнага, неспакойнага жыцця яго бацькоў, яго аднавяскоўцаў, старых і малых, хворых і нямоглых. Попел чарнобыля засыпаў маляўнічыя краявіды сожскіх паплавоў, заток і бароў, якія з маленства палюбіў будучы паэт. Чарнобыльская паэзія з плачам і болем улілася ва ўсе жылкі кожнага чалавека:

Я крочыў дамоў небам
зямлёю туды нельга... *(«Я крочыў дамоў небам»)* [1, с.37]

Асэнсаванне трагічнасці лёсу сваей краіны нярэдка нараджае адчуванне безвыходнасці, ратавацца ад якой яму дапамагае самае высокае пачуццё -- Каханне:

Мы бязмэтна блукалі ў часе,
самахоць нашы душы гарнуліся.
І здавалася, поруч шчасце,
калі раптам шляхі размінуліся. *( «Каханне»)* [1, с.26]

Для Э. Акуліна «каханне — ёсць мудрасць, якую Бог людзям адкрыў, каб грахі даравацць». Але калі ў ранняй творчасці гэтае вялікае пачуццё, ахінутае рамантычнасцю, узнёсласцю, імкнецца да нябёсаў, дзе валадарыць Чысціня, Згода і Пяшчота, дык у апошніх вершах Каханне бязлітасна скінута паэтам на зямлю да ног крывадушнасці, сляпога задавальнення, здрады:

Закахацца, як у юнацтве,
я наўрад ці ўжо змагу...
Бо каханне лічу за працу,
а калісьці лічыў за цуд! *(«Закахацца»)*[3, с.61]

Э. Акулін стварае «прасветлыя», паэтычна акрыленыя вобразы Жанчыны, услаўляе яе ўнутраную прыгажосць, выказвае глыбокую пашану да яе як да прадаўжальніцы роду чалавечага, шчыра захапляецца вабнотамі жаночага цела. Ды варта натрапіць на верш «Нежанчынам», як усе «хваласпевы» пададуцца пустымі, пазбаўленымі свайго высокага сэнсу. Жыццё зноўку вымушае сысці з нябёсаў на зямлю. Гэты верш — прысвячэнне тым прадстауніцам «цудоунай» паловы чалавецтва, якія выракаюцца свайго святога прызначэння, сваіх дзяцей. Паэт адмаўляе ім ў праве «жанчынамі звацца». Магчыма, верш «Нежанчынам» (як і некаторыя іншыя творы Э. Аку-ліна) узнік як паэтычная рэфлексія на вершы М. Багдановіча з цыкла «Мадонны» ў кантэксце іншачасавага жыцця.[4] :

Галоўка, ручкі, ножкі –
і ў прыбіральні тут...
Хай нежанчыне кожнай
прысніцца гэты труп *(«Нежанчынам»)* [1, с.31]

Паэзія Эдуарда Акуліна ўвабрала трапныя, маляўнічыя вобразы, рухомыя асацыяцыі, тонкія, ледзь улоўныя адчуванні на струнах шчымлівых уражанняў. Зрэдку ў паэтычную тканіну твораў уплятаецца нітка пачуццяў болю, што робіць яе больш моцнай, трывалай і каштоўнай, бо немагчыма яе разарваць на кавалкі, як немагчыма пазбавіць творцу любові да роднай зямлю, адчування вечнасці і незваротнасці часу.

Тэматычны агляд творчасці Э. Акуліна далёка не вычарпальны. Кожны можа адшукаць у ягонай паэзіі мноства іншых тэмаў і паэтычных шляхоў іх спасціжэння.

ЛІТАРАТУРА

1 Акулін, Э. Пяшчота ліўня / Э.Акулін. – Мінск. : Выдавецтва ЦК КП Беларусі, 1990
2 Акулін, Э. Радно. Вершы / Э.Акулін. – Мінск. : "ПаліБіг", 2000;
3. Акулін, Э.Непрычалены човен. Вершы і балады / Э.Акулін. – Мінск. : 2003;
4 Дзенісюк, Н. З радкоў сатканае рандо асвечана крылом анёла / Н.Дзенісюк // Маладосць. – 2004. – № 2.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ